ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Камуністычная партыя Беларусі

# ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ, ВЯРХОЎНАГА САВЕТА І САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР

Год выдання 46-ы

№ 110 (13176)
НЯДЗЕЛЯ
12
мая
1963 года

Цана 2 кап.

# САВЕТЫ І БЫТ

Ц. КІСЯЛЁЎ
Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР

Усё больш поўнае задавальненне патрэбнасцей людзей магчыма толькі на аснове ўсямернага развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі, навукі і культуры. Значыць, кожны член нашага грамадства павінен прымаць актыўны ўдзел у ажыццяўленні галоўнай эканамічнай задачы, пастаўленай Праграмай партыі, — у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, павялічваючы сваёй працай матэрыяльныя і культурныя даброты. Але з другога боку, добра ўладкаваны быт, высокая культура абслугоўвання ўзнімаюць настрой людзей, дапамагаюць ім лепш працаваць. «Пытанні бытавога абслугоўвання — гэта не дробязі, не другарадныя рэчы, — гаварыў тав. М. С. Хрушчоў на XXII з'ездзе КПСС. — Ад таго, наколькі ўпарадкаваны быт чалавека, якая культура абслугоўвання, у многім залежыць і настрой людзей і прадукцыйнасць іх працы».

Перабудова кіравання прамысловасцю, будаўніцтвам і сельскай гаспадаркай стварыла самыя спрыяльныя ўмовы для павышэння ролі мясцовых Саветаў у арганізацыі культурна-бытавога абслугоўвання насельніцтва. Гэта той участак каму-

нат бытавога абслугоўвання, сталовая, некалькі шматкватэрных дамоў, клуб, пачатковая школа, санаторый. Хутка будзе здадзены ў эксплуатацыю будынак новай сярэдняй школы.

Мы ставім задачу, каб у кожным раёне быў адзіны план культурна-бытавога будаўніцтва, а ў кожнай вёсцы — план добраўпарадкавання. Распрацоўка такіх планаў пачалася ўжо. Аўтары іх — тысячы актывістаў.

Пра добрыя справы можна расказваць доўга. Але можна прывесці і прыклады, калі надзённыя па-

патрабуюць, каб і некаторыя саюзныя, асабліва плануючыя органы з вялікай увагай аднесліся да пытанняў бытавога абслугоўвання. На наш погляд, неабходна будаўніцтва буйных, тэхнічна аснашчаных бытавых прадпрыемстваў прадугледжваць народнагаспадарчым планам і будаваць гэтыя прадпрыемствы не толькі за кошт нецэнтралізаваных крыніц, але і за кошт дзяржаўных капіталаўкладанняў.

Сучасны ўзровень матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння бытавых прадпрыемстваў не адпавядае ўзрослым патрабаванням. Часта бывае так, што планы забеспячэння гэтых прадпрыемстваў разглядаюцца ў апошнюю чаргу і недастаткова выдзяляюцца неабходныя матэрыялы. Што ж атрымліваецца? У магазінах ёсць даволі шырокі выбар шарсцяных і іншых тканін, а нельга сказаць пра швейныя прадпрыемствы бытавога абслугоўвання. Рэспубліканскія органы самастойна не могуць перадаваць неабходныя матэрыялы з рыначнага фонду для індывідуальнай пашыўкі. Трэба было б перагледзець гэты парадак. Плануючыя органы павінны выдзяляць мэтавым прызначэннем для прадпры-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ